УДК 882.6.073+882.6(092)

# Параўнаўчы аналіз аказіянальнай лексікі ў творчасці сучасных беларускіх паэтаў

Івашчанка А.С.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Расшыфроўка дэфініцыі "сучасны беларускі паэт" завязаная на суб'ектыўнасці падыходаў да праблематыкі ды яе інтэрпрэтацыяў. Прыблізная класіфікацыя пакаленняў сучасных беларускіх паэтаў можа выглядаць наступным чынам: філалагічнае пакаленне, "тутэйшаўцы", "бумбаўлітаўцы", новая генерацыя.

Для вырашэння задач гэтага даследавання прапануецца параўнаўчы аналіз некаторых найбольш заўважных тэкстаў сучасных беларускіх паэтаў – Рыгора Барадуліна, Алеся Разанава, Андрэя Хадановіча, Віктара Жыбуля, Валярыны Куставай), у якіх уводзіцца аказіянальная лексіка.

У дакладзе даследуюцца спосабы ўтварэння аказіяналізмаў у творчасці названых паэтаў, а менавіта – *шырасць, тухпацік, рунявасць і інш.* (Р. Барадулін); *ведзьмавала, мембранна, міжчассе, прадчассе, утульвацца ў бяспеку – адтульвацца для свабоды, рунлівее, птахчымасці, невідзімнасць, праўчора, раскалоджвацца* і інш (А. Разанаў); аказіянальныя ўтварэнні розных ступеняў параўнання слова "пуп", *кувалдаметрычная фундаменталь* (В. Жыбуль); *злыдухі, белаўнукі, храмабарвы, вершапакосы* (В. Кустава).

Асобнай увагі патрабуе перакладніцкая дзейнасць Алеся Разанава, а менавіта – кніга перакладаў з рускага паэта Вяліміра Хлебнікава. У некаторых вершах, якія былі перакладзены, большая частка слоў з'яўляецца аказіяналізмамі.

Увядзенне аказіянальнай лексікі як спосаб папаўнення пасіўнага запасу лексікі беларускай мовы (неалагізмы ў вершы Леаніда Дранько-Майсюка "Хвалебная песня навасловам").

Параўнаўчы аналіз творчасці старэйшых паэтаў (г. зв. "філалагічнае пакаленне") і новай генерацыі дазваляе канстатаваць, што пры адрозных, а часам і дыяметральна супрацьлеглых эстэтычных візіях звышмэтай і першых, і другіх ёсць пашырэнне актыўнага запасу лексікі, развіццё крэатыўных магчымасцей беларускай мовы.

Аказіянальная лексіка сучаснай беларускай паэзіі – малавывучаная частка словатворчасці, выкарыстанне якой з'яўляецца прадуктыўным шляхам узбагачэння вобразнасці паэтычнага тэксту і патрабуе ўдумлівага вывучэння.